*УДК 94(47) : 94(438) «1919/1920» : 930(47) «1920/1941»*

*М. М. МЯЗГА*

# ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЯ ВАЙНА 1919–1920 гг. У САВЕЦКАЙ МІЖВАЕННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны*

*(Паступіў у рэдакцыю 20.04.2010)*

Польска-савецкая вайна 1919–1920 гг. з'яўляецца адным з найбольш драматычных момантаў у гісторыі беларускага народа. Яна прынесла Беларусі велізарныя матэрыяльныя і людскія страты. Уварванне польскіх войскаў зрабіла істотны ўплыў на дзяржаватворчыя працэсы на беларускіх землях. У выніку гэтых падзей Беларусь амаль на дваццаць гадоў аказалася падзеленай на дзве часткі. Польска-савецкая вайна 1919–1920 гг. значна паўплывала на міжнароднае становішча Савецкай Расіі, а затым Савецкага Саюза. Гістарычная значнасць гэтых падзей абумовіла вялікую цікавасць да іх гісторыкаў. Даследаванне гісторыі польска-савецкай вайны пачалося яшчэ ў час яе правядзення. У дадзеным артыкуле мы зробім спробу высветліць, якія аспекты гісторыі польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. знайшлі найбольшае адлюстраванне ў савецкай гістарыяграфіі міжваеннага часу. Да даследчых задач, вырашаемых у артыкуле, адносіцца і вызначэнне ступенні навуковай аб'ектыўнасці тых канцэпцый і ацэнак, якія выпрацавала савецкая гістарычная навука ў 20–30-я гг. XX ст. пры вывучэнні гісторыі польска-савецкай вайны. Пры гэтым важна ўлічваць спецыфіку развіцця тагачаснай гітарыяграфіі па ўказанай праблеме. Па-першае, даследаваліся падзеі, якія адбыліся зусім нядаўна, а таму мелі высокую палітычную актуальнасць. Па-другое, на развіццё гістарыяграфіі моцны ўплыў зрабіла тая ідэйна-палітычная барацьба, якая ў міжваенны час вялася паміж Савецкай Расіяй (СССР) і Польшчай.

Савецкія гісторыкі пры вывучэнні польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. найбольш значную ўвагу ўдзялілі вызначэнню яе прычын. На іх думку, польскія правячыя колы імкнуліся перш за ўсё да аднаўлення панавання памешчыкаў на землях Беларусі, Украіны, Літвы. Адзначаны тэзіс гучыць у вялікай колькасці даследаванняў. К. Радэк пісаў: «Зыходным пунктам палітыкі польскага ўрада ў адносінах да Расіі з'яўляецца жаданне вырваць з рук сялян, якіх вызваліла руская рэвалюцыя, землі і вярнуць іх буйным польскім памешчыкам» [1, с. 6]. Але для гэтага трэба было знішчыць «Савецкія Рэспублікі Літвы і Беларусі» [2, № 4, с. 165].

Да імкнення Польшчы захапіць украінскія і беларускія тэрыторыі зводзіць асноўную прычыну вайны і М. Паўловіч. У сваім даследаванні ён адзначае імкненне польскай шляхты навязаць Савецкай Расіі і Украіне граніцы 1772 г. Праз захоп тэрыторый польскі ўрад імкнецца, па-першае, адгарадзіцца ад расійскай рэвалюцыі, па-другое, захапіць сыравіну для польскай прамысловасці, вярнуць памешчыкам іх землі [3, с. 4, 22–23]. Тэзіс аб імкненні вярнуць польскім памешчыкам іх маёнткі на тэрыторыі Беларусі і Украіны трывала замацаваўся ў савецкай гістарыяграфіі і выразна прасочваецца ў працах сярэдзіны – другой паловы 1930-х гг. Прыкладам можа служыць даследаванне М. Віслінскага, дзе ён піша: «... паход Пілсудскага на Кіеў у 1920 г. быў спробай заваяваць калонію для польскага фінансавага і прамысловага капіталу, спробай вярнуць польскім памешчыкам маёнткі і землі ....» [4, с. 43]. Як адну з прычын, якія выклікалі вайну Польшчы супраць Савецкай Расіі, гісторыкі называюць імкненне Антанты выкарыстаць польскую армію для звяржэння ўлады бальшавікоў. К. Радэк адзначаў, што польская вайна была часткай вайны,

якую Антанта вяла супраць савецкай рэспублікі з канца 1918 г. [5, с. 55]. Яшчэ больш выразна гэты пункт гледжання гучыць у даследаваннях Я. Іофе, які пісаў: «Асноўную ролю ў польскай авантюры адыгрываў міжнародны капітал, асабліва французскі ...» [6, с. 154].

У другой палове 1930-х гг. у савецкай гістарыяграфіі канчаткова замацоўваецца тэзіс аб польска-савецкай вайне як частцы паходаў Антанты супраць Савецкай Расіі. Л. Ломаў пісаў, што польскія правячыя колы прынялі самы актыўны ўдзел як у другім, так і трэцім паходах Антанты [7, с. 6–8]. Д. Дудкоў зводзіць ролю Польшчы ў польска-савецкай вайне да «выканаўцы волі Антанты, у прыватнасці, імперыялістычнай Францыі». Але далей указаны аўтар прызнае наяўнасць у Польшчы ўласных імперыялістычных планаў [8, с. 114, 115]. І. Лочмель указвае, што ўжо вясной 1919 г. наступленне польскай арміі ўяўляла сабой частку першага паходу Антанты супраць Савецкай Расіі. Польшча ўдзельнічала і ў другім паходзе Антанты восенню 1919 г. Праўда, пры гэтым і ён адзначае наяўнасць у Польшчы ўласных імперыялістычных планаў, якія ўключалі захоп Беларусі, Літвы і Украіны [9, с. 10–12]. Вайну Польшчы супраць Савецкай Расіі як частку ўсіх трох паходаў Антанты характарызуе Ф. Папоў. Ён адзначае, што «панская Польшча» была створана «англійскімі і французскімі магнатамі з дапамогай банкіраў Злучаных Штатаў Амерыкі» і была «паслухмянай зброяй у руках Антанты» [10, с. 44].

З пытаннем аб прычынах вайны цесна звязана і пытанне аб яе характары. К. Радэк адзначаў асаблівасці характару вайны, якую Савецкая Расія вяла супраць Польшчы ў параўнанні з расійскай Грамадзянскай вайной. Па яго словах, гэта была вайна не толькі класавая, але і нацыянальная, за незалежнасць Расіі [1, с. 20]. На асаблівасці храктару вайны з палякамі ўказвае і П. Суслаў. Як і Грамадзянская вайна, яна была вайной класавай. Але «вайна з белапалякамі з'яўлялася разам з тым вайной з замежнымі капіталістамі, чужаземнымі белагвардзейцамі. Шырокім масам працоўных савецкіх рэспублік яна прадстаўлялася таму перш за ўсё вайной за нацыянальную незалежнасць, яе класавая сутнасць затушоўвалася» [11, с. 23].

З названымі асаблівасцямі характару вайны з Польшчай звязаны ўздым рускага нацыяналізму ў 1920 г., што прызнавала савецкая міжваенная гістарыяграфія. Пра гатоўнасць значнай часткі рускага грамадства, якая не сімпатызавала бальшавікам, падтрымаць савецкі ўрад як абаронцу незалежнасці Расіі пісаў К. Радэк [1, с. 14]. У савецкай гістарыяграфіі адзначаецца, што «нават значная частка буржуазіі і афіцэраў старой арміі выявіла жаданне па меры сіл і магчымасцей спрыяць перамозе Чырвонай Арміі» [12, с. 185]. Уздым рускага нацыяналізму адзначае і П. Суслаў, па словах якога, ён нават пачаў перарастаць у вялікадзяржаўны шавінізм [11, с. 21].

У цеснай сувязі з пытаннем аб характары вайны знаходзіцца і пытанне аб прычынах паходу Чырвонай Арміі на Варшаву. Савецкая гістарыяграфія адхіляла тэзіс польскай аб «імкненні да насаджэння камунізму як асноўным матыве паходу на Віслу». Па сцвярджэнні Ю. Мархлеўскага, «паход на Варшаву быў вынікам контррэвалюцыйных і захопніцкіх планаў польскай палітыкі» [13, с. 20].

Але ў манаграфіях савецкіх аўтараў, якія пабачылі свет у пачатку 1920-х гг., прызнаецца імкненне выклікаць сацыялістычную рэвалюцыю ў Польшчы і ў Еўропе як адна з важнейшых мэт паходу Чырвонай Арміі на Варшаву. Ю. Мархлеўскі сцвярджае, што ажыццяўленне ў Польшчы сацыялістычнай рэвалюцыі не было самастойнай мэтай у ходзе наступлення Чырвонай Арміі на Варшаву. Але калі Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Польшчы, то як армія пралетарскай дзяржавы непазбежна павінна была праводзіць палітыку разбурэння буржуазнага ладу і стварэння сістэмы саветаў [13, с. 21]. У. Пячэта таксама піша пра знішчэнне Чырвонай Арміяй буржуазнага ладу на тэрыторыі Польшчы і ўвядзенне ёю сістэмы саветаў. Польрэўкам стварыўся менавіта для таго, каб дапамагчы польскім рабочым і сялянам ва ўсталяванні савецкай сістэмы [2, № 6, с. 126]. У такім грунтоўным выданні, як «Грамадзянская вайна 1918–1921», пытанне аб перспектывах рэвалюцыі ў Польшчы вырашаецца супярэчліва. З аднаго боку, адзначаецца, што нацыяналістычныя настроі згуртавалі польскае грамадства, і тое ж сялянства ў лепшым выпадку ставілася да Чырвонай Арміі нейтральна, а ў большасці – варожа. З другога боку, заяўляецца аб наяўнасці абгрунтаваных падстаў для разлікаў на сацыялістычную рэвалюцыю ў Польшчы [14, с. 392].

М. Тухачэўскі таксама ставіць пытанне аб магчымасці сацыялістычнай рэвалюцыі ў Польшчы і дае на яго станоўчы адказ. Гэты вывад ён абгрунтоўвае наяўнасцю ў Польшчы моцнага

пралетарскага і сялянскага руху. Толькі паражэнне Чырвонай Арміі на Вісле не дало магчымасці спраўдзіцца гэтым спадзяванням [15, с. 61–63]. Іншага пукнкту гледжання прытрымліваецца В. П. Друнін. Ён адзначае, што антыбальшавіцкая прапаганда знаходзіла падыходзячую глебу сярод польскага насельніцтва, і «рэвалюцыйная Чырвоная Армія ... адчувала сябе ў занятых ёю абласцях акружанай з усіх бакоў варожасцю і здрадай» [12, с. 191]. П. Суслаў падкрэслівае, што вайна з Польшчай была вайной за перамогу сусветнай рэвалюцыі, бо белая Польшча спрабавала пашырыць бар’ер паміж Савецкай Расіяй і ўздымаўшымся пралетарыятам Еўропы, у першую чаргу – Германіі. Але ён прызнае, што сацыяльная база для саветызацыі Польшчы была вельмі абмежаванай [11, с. 21, 140]. У канцы 1930-х гг. крытычны аналіз пытанняў, звязаных з падштурхоўваннем сусветнай рэвалюцыі, стаў немагчымы. Тым больш нельга было весці гаворку пра адмоўнае стаўленне польскага народа да ўступлення Чырвонай Арміі на этнічныя польскія тэрыторыі. Безапеляцыйна адзначалася, што «рабочыя і бяднейшае сялянства Польшчы чакалі дапамогі Савецкай Расіі і з захапленнем сустракалі Чырвоную Армію» [9, с. 43–44].

Дастаткова шмат увагі савецкія гісторыкі ўдзялілі вывучэнню ходу польска-савецкай вайны. Адносна няшмат гаворыцца пра падзеі 1919 г. і дастакова падрабязна даследуюцца аперацыі 1920 г. Ю. Мархлеўскі, вызначаючы прычыны поспехаў польскай арміі ў 1919 г., указвае на тое, што Савецкая Расія вымушана была накіроўваць галоўныя сілы для абароны іншых франтоў і не магла абараніць заходні фронт [13, с. 12]. Фактычна тую ж прычыну хуткага руху наперад польскай арміі ўказвае і І. Ф. Лочмель, які адзначае вялікую кольскасную перавагу палякаў [9, с. 13].

Аналізуючы ход ваенных дзеянняў у 1920 г., савецкія гісторыкі рабілі выснову, што савецкае галоўнае камандаванне не надавала вялікага значэння ўкраінскаму тэатру ваенных дзеянняў, а разглядала яго як дапаможны для беларускага [14, с. 308]. Адпаведна, поспехі Пілсудскага на Украіне не маглі мець рашаючага значэння для зыходу вайны. На думку М. Тухачэўскага, вясной 1920 г. становішча на Заходнім фронце было спрыяльнае для Чырвонай Арміі, паколькі мелася магчымасць перакінуць сюды буйныя сілы з іншых франтоў. Але пры гэтым ён прызнае, што польскія войскі былі лепш узброены і арганізаваны [15, с. 42]. З гэтым пунктам гледжання аб магчымасці сканцэнтраваць асноўныя сілы Чырвонай Арміі супраць Польшчы не пагаджаецца Б. Шапашнікаў. Па яго словах, савецкія войскі вясной 1920 г. былі заняты яшчэ на многіх іншых франтах [16, с. 10].

Аналізуючы вынікі савецкага наступлення на Украіне і Беларусі летам 1920 г., савецкая гістарыяграфія ацэньвала іх дастаткова аб’ектыўна. У даследаванні «Грамадзянская вайна 1918–1921» адзначалася, што ў ходе баёў на Украіне Чырвоная Армія не змагла «ўнесці дастатковага разладу ў жывую сілу праціўніка і, у прыватнасці, знішчыць 3-ю Польскую армію». На Беларусі ў выніку ліпеньскага наступлення «моцна пацярпелай аказалася толькі 1-я Польская армія, 4-я Польская армія і Палеская група адыходзілі добраахвотна і ў парадку» [14, с. 355, 375]. Тым самым не заставалася месца для сцвярджэння аб поўным разгроме польскай арміі на савецкім фронце. Фактычна прызнавалася, што польскаму камандаванню ўдалося арганізавана адвесці свае галоўныя сілы, якія потым былі выкарыстаны ў бітве на Вісле.

Сама гэтая бітва даследуецца даволі грунтоўна. Савецкія гісторыкі перш за ўсё імкнуцца вызначыць прычыны паражэння Чырвонай Арміі. Ю. Мархлеўскі прызнае, што адной з прычын паражэння на Вісле стала адмоўнае стаўленне мясцовага насельніцтва да Чырвонай Арміі, ад рэквізіцый якой яно моцна пацярпела. Негатыўны настрой насельніцтва быў вынікам і памылак у нацыянальным пытанні [13, с. 23–25]. К. Радэк адну з галоўных прычын паражэння на Вісле бачыць у тым, што Чырвоная Армія адарвалася ад сваіх баз, а гэта стварыла вялікія праблемы з яе матэрыяльным забеспячэннем. Таксама ён указвае на адсутнасць узгодненасці ў дзеяннях Заходняга і Паўднёва-Заходняга франтоў [5, с. 62]. Прычым да пачатку 1930-х гг. за разрозненасць дзеянняў крытыкавалася камандаванне Паўднёва-Заходняга фронту, у склад якога ўваходзіў І. Сталін [14, с. 411, 423].

М. Тухачэўскі ўказвае перш за ўсё на ваенна-тэхнічныя прычыны паражэння. У якасці другой прычыны паражэння Чырвонай Арміі ён называе змяненне колькасных суадносін сіл на карысць польскай арміі. Прызнае ён і тое, што польскае камандаванне прыняло правільны і смелы план дзеянняў у баях на подступах да Варшавы [15, с. 48–49, 72–73]. На думку Б. Шапашнікава, па-

ражэнню садзейнічаў і няправільны выбар Тахачэўскім напрамку галоўнага ўдара на поўнач ад Варшавы, які прыйшоўся па пустым месцы, а не па галоўных сілах палякаў [16, с. 191]. У якасці адной з прычын паражэння савецкія гісторыкі называюць пераацэнку слабасці польскай дзяржавы [14, с. 393].

У канцы 1930-х гг. карэнным чынам мяняюцца акцэнты пры вызначэнні прычын паражэння на Вісле. На першы план выходзіць суб'ектыўны момант, а галоўнымі віноўнікамі паражэння выступаюць тыя, хто трапіў пад сталінскія рэпрэсіі. І. Ф. Лочмель у сваім даследаванні, якое было выдадзена ў 1939 г., так характарызуе прычыны паражэння Чырвонай Арміі пад Варшавай: «Наступленне Чырвоных войск на заходнім фронце ў бок Варшавы праходзіла па віне Троцкага і Тухачэўскага зусім неарганізавана... Шкодніцкім загадам Троцкі навязаў войскам паўднёвага фронту адступленне з-пад Львова» [9, с. 44]. Характэрна, што гаворка ідзе толькі пра паражэнне Заходняга фронту, і не прыгадваюцца няўдачы Паўднёва-Заходняга фронту. Ф. Папоў таксама ўсю віну за паражэнне Чырвонай Арміі на Вісле ўскладае на Троцкага і Тухачэўскага: «Польскія войскі былі напярэдадні поўнага паражэння. Але з прычыны здрадніцкіх дзеянняў Троцкага і Тухачэўскага наша армія вымушана была адступіць ад сцен Львова і Варшавы» [10, с. 57].

Савецкія гісторыкі дастаткова актыўна даследавалі спробы мірнага ўрэгулявання польска-савецкага канфлікту ў 1919 – пачатку 1920 г. У манаграфіях пачатку 1920-х гг. прыгадваліся тайныя перагаворы Ю. Мархлеўскага. К. Радэк адзначае, што кіраўнікі Польшчы фактычна пайшлі на тайнае пагадненне з Савецкай Расіяй, паколькі царскіх генералаў баяліся больш, чым бальшавікоў [5, с. 56]. Найбольш грунтоўна на гэтым пытанні спыняецца сам Ю. Мархлеўскі. На яго думку, штуршком да перагавораў стала палітыка Антанты, накіраваная на падтрымку Калчака і іншых белых генералаў, якія выступалі за «адзіную і непадзельную Расію». У ходзе кантактаў Мархлеўскага з прадстаўнікамі Пілсудскага савецкі ўрад выказаў гатоўнасць пайсці на вялікія тэрытарыяльныя саступкі. Вынікам стала ўсталяванне фактычнага перамір'я на савецка-польскім фронце [13, с. 5].

З моманту зараджэння савецкай гістарыяграфіі польска-савецкай вайны яна ўсяляк абгрунтоўвае тэзіс аб міралюбнасці палітыкі Савецкай Расіі і яе імкненні пазбегнуць вайны з Польшчай. Ужо ў 1920 г. М. Паўловіч пісаў: «Савецкі ўрад імкнецца да міру, які дасць яму магчымасць арганізаваць эканамічнае жыццё Расіі» [3, с. 6]. Гэты ж тэзіс гучыць у даследаваннях К. Радэка, які піша пра шчырае імкненне Савецкай Расіі да міру з Польшчай пасля разгрому Калчака і Дзянікіна [5, с. 56].

Савецкі бок, імкнучыся да мірнага ўрэгулявання з Польшчай у канцы 1919 – пачатку 1920 г., гатоў быў пайсці на вялікія тэрытарыяльныя саступкі. К. Радэк тлумачыць прычыны гэтай гатоўнасці: «Гэта мы рабілі (тэрытарыяльныя саступкі. – *М. М.*) таму, што ведалі, што ў Польшчы нарастае рэвалюцыя рабочых, што ў Польшчы, магчыма, праз паўгода ці год рабочыя возьмуць уладу, вызваляць сялян Літвы і Беларусі» [1, с. 17]. У яшчэ адной працы, якая пабачыла свет некалькімі гадамі пазней, К. Радэк зноў спыніўся на гэтым пытанні. Ён піша: «У лясах і балотах Беларусі не заключалася ніякіх жыццёвых інтарэсаў Савецкай Расіі. Валоданне Беларуссю толькі ўскладняе эканамічнае становішча буржуазнай Польшчы» [5, с. 64]. Фактычна такі ж погляд на праблему агучвае ў сваёй манаграфіі і Ю. Мархлеўскі. Па яго словах, члены савецкага ўрада былі пераканаваны, што ўсе магчымыя лініі граніц у бліжэйшым будучым страцяць усялякае значэнне, бо рэвалюцыйны пераварот ва ўсёй Еўропе з'яўляецца толькі пытаннем некалькіх гадоў. На думку савецкіх палітыкаў, буржуазная Польшча ўсё роўна была б не ў стане ўтрымліваць сваё панаванне над беларускімі сялянамі [13, с. 13]. На згоду савецкага ўрада дзеля дасягнення міру прызнаць у якасці граніцы лінію фронту па Бярэзіне ўказвае і І. Ф. Лочмель [16, с. 21]. Няўдачу спроб мірнага ўрэгулявання вясной 1920 г. савецкія гісторыкі бачаць перш за ўсё ў нежаданні палякаў адмовіцца ад Барысава як месца перагавораў і пайсці на заключэнне перамір'я на ўсім фронце, бо яны планавалі наступленне на Украіне [3, с. 3]. П. Суслаў лічыць, што Польшча адхіліла савецкія мірныя прапановы па загаду Антанты [11, с. 18–19].

Звяртаюцца савецкія гісторыкі і да даследавання тых унутраных працэсаў, якія адбываліся на Беларусі ў час вайны. Перш за ўсё яны ў самых змрочных колерах малююць польскі акупацыйны рэжым на Беларусі. М. Паўловіч адзначае, што ва ўмовах польскай акупацыі сістэматыч-

наму праследаванню падвяргаюцца беларускія школы, якія былі пазбаўлены ўсялякіх сродкаў існавання. З даследавання названага аўтара вынікае, што гэта частка больш шырокай палітыкі польскага ўрада, якая мае на ўвазе паланізацыю насельніцтва акупаваных тэрыторый [3, с. 15, 37]. Шмат увагі рэпрэсіўнай палітыцы палякаў на акупаванай тэрыторыі ўдзяліў Д. Дудкоў, які прыводзіць велізарную колькасць фактаў аб тэроры акупацыйных улад [8, с. 116–117]. Таксама вялікі фактычны матэрыял па гэтым пытанні змяшчаюць даследаванні Ф. Папова [10, с. 53–54]. Асаблівы акцэнт рабіўся на класавым характары акупацыйнага рэжыму. І. Ф. Лочмель адзначаў аднаўленне палякамі ў акупаванай частцы Беларусі «буржуазна-памешчыцкага ладу» [9, с. 24].

У тагачасных працах савецкіх гісторыкаў адносна невялікая ўвага надавалася разгортванню партызанскага руху. М. Паўловіч толькі адзначыў стварэнне беларускімі сялянамі партызанскіх атрадаў [3, с. 16]. Д. Дудкоў падкрэслівае ролю бальшавіцкай партыі ў арганізацыі партызанскага руху. Аўтар адзначае, што буйныя атрады па 200–400 чалавек дзейнічалі па ўсёй тэрыторыі Беларусі [8, с. 125]. Але яшчэ не было манаграфій, дзе б дэталёва даследаваўся б працэс разгортвання партызанскага руху на Беларусі супраць польскай акупацыі.

У 1930-я гады ў Беларусі вядзецца кампанія супраць так званых «нацдэмаў». Гэта актуалізавала даследаванне ўзаемаадносін прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху з Польшчай. У пабачыўшым свет у 1930 г. даследаванні П. Суслаў яшчэ не прыпісваў беларускім «нацдэмам» адназначна здрадніцкага супрацоўніцтва з Польшчай. Ён адзначаў і актыўныя пратэсты беларускіх нацыянальных арганізацый супраць польскіх планаў уключэння Беларусі ў склад польскай дзяржавы з прадастаўленнем ёй самакіравання. Яны патрабавалі поўнай незалежнасці для Беларускай рэспублікі. У той жа час ён адзначае, што Пілсудскі ўжо ў 1920 г. змог стварыць сваю агентуру ў Беларусі (урад Ластоўскага) і ва Усходняй Галіцыі (урад Лявіцкага) [11, с. 16, 17]. У наступныя гады з'яўляецца серыя манаграфій, аўтары якіх ацэньваюць палітыку беларускіх нацыянальных дзеячаў у час польска-савецкай вайны як безумоўна здрадніцкую. Д. Дудкоў у гэтай сувязі пісаў: «Белапольскія акупанты ... знайшлі ў асобе беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якія не грэбавалі ніякай подлай і бруднай контррэвалюцыйнай работай, шчырых і надзвычай паслужлівых і актыўных памочнікаў» [8, с. 114]. У даследаваннях І. Ф. Лочмеля гучыць абвінавачванне «контррэвалюцыйнай Беларускай Рады з памешчыкаў і буржуазіі» ў пасобніцтве польскім акупантам. Урад БНР на чале з Ластоўскім характарызуецца аўтарам як марыянетачны, «які прысмыкаўся перад Пілсудскім і з вялікай стараннасцю служыў сваім польскім гаспадарам» [9, с. 29, 31]. Па словах І. Ф. Лочмеля, беларускія нацыяналісты спрабавалі стварыць «беларускае войска», каб «дапамагчы польскім панам захапіць і зняволіць Беларусь» [17, с. 101].

Цікавым уяўляецца пытанне аб адносінах урада Польшчы да белага руху. К. Радэк адзначаў, што калі б польскія войскі пачалі наступленне на Смаленск і Маскву адначасова з наступленнем Юдзеніча і Дзянікіна, то, магчыма, бальшавікі былі б пераможаны. Далей ён тлумачыць, чаму гэта не адбылося: «Яны не пайшлі таму, што ведалі, што белыя генералы, апынуўшыся ва ўладзе, павінны зноў захапіць Польшчу» [1, с. 13]. У другой палове 1930-х гг. Польшча адназначна стала падавацца ў савецкай гістарыяграфіі як саюзніца расійскага белага руху. І. Ф. Лочмель указваў, што, пачынаючы наступленне ў красавіку 1920 г., польскае камандаванне разлічвала «аб'яднацца з Урангелем, які рыхтаваў удар з Крыма на Украіну, з тым, каб аб'яднанымі сіламі павесці наступленне на Савецкую Расію па ўсім фронце» [17, с. 99]. Спыненне польскага наступлення на Бярэзіне ў 1919 г. стала тлумачыцца тым, што ўздоўж гэтай ракі была створана «непрыступная лінія абароны, якая затрымала прасоўванне ў глыб краіны» польскай арміі [10, с. 51].

Савецкая гістарыяграфія звярнулася і да вызначэння вынікаў вайны. Галоўны вынік вайны бачыўся ў тым, як адзначаў Ю. Мархлеўскі, што Польшча вымушана была ўсё ж пагадзіцца на мірныя перагаворы. Важным вынікам вайны, на яго думку, стала і тое, што палякі атрымалі значна меншыя тэрыторыі, чым савецкі ўрад пагаджаўся ім аддаць вясной 1920 г. [13, с. 37–38]. У «Грамадзянскай вайне 1918–1921» на гэты конт указваецца: «... польскі ўрад у выніку 1920 г. не дасягнуў сваіх асноўных мэт, якія заключаліся ў выхадзе польскай дзяржаўнасці на ўсходзе на лінію польскіх палітычных граніц 1772 г.» [14, с. 469]. Тое, што Польшча ў выніку падзей 1920 г. атрымала менш, чым ёй прапаноўвалася да аднаўлення ваенных дзеянняў, адзначае і П. Суслаў. У прыватнасці, была вызвалена значная частка захопленай ёю тэрыторыі Украіны і Беларусі,

уключаючы Мінск [11, с. 23]. І. Ф. Лочмель да важнейшых вынікаў вайны адносіць тое, што «толькі дзякуючы перамозе над Польшчай працоўныя Беларусі атрымалі магчымасць будаваць сацыялістычную дзяржаву рабочых і сялян» [9, с. 45]. Галоўны вынік вайны Я. Іофэ бачыць у тым, што «спроба французскіх імперыялістаў задушыць рускую рэвалюцыю сіламі польскай арміі скончылася, як і ўсе папярэднія спробы, поўнай няўдачай» [6, с. 157].

Неабходна адзначыць, што многія важныя праблемы гісторыі польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. не знайшлі належнага асвятлення ў савецкай міжваеннай гістарыяграфіі. Даволі слаба было вывучана савецкімі гісторыкамі міжваеннага часу пытанне аб мабілізацыі рэсурсаў Беларусі і аб яе людскіх і матэрыяльных стратах у ходзе вайны. Яно закранаецца ў даследаваннях Ф. Папова, але зводзіцца толькі да канстатацыі мабілізацыі на фронт камуністаў, камсамольцаў, членаў прафсаюзаў [10, с. 45–46]. Таксама не атрымала належнага вывучэння пытанне аб другім абвяшчэнні БССР. Пры фармуляванні сваіх канцэпцый і вывадаў савецкія гісторыкі былі падвергнуты моцнаму ўздзеянню палітычнага фактару. Гэта асабліва яскрава праявілася пры даследаванні такіх пытанняў, як прычыны ўзнікнення вайны, прычыны паражэння Чырвонай Арміі на Вісле, узаемаадносіны беларускага нацыянальнага руху і польскіх акупантаў.

## Літаратура


1. Р а д е к, К. Война польских белогвардейцев против Советской России / К. Радек. – М.: Госиздат, 1920. – 24 с.
2. П і ч э т а, У. Польска-савецкія адносіны і Рыжскі мір / У. Пічэта // Полымя. – № 4–6. – С.146–166.
3. П а в л о в и ч, М. П. Война с польскими панами (Польско-шляхецкая авантюра) / М. П. Павлович. – М.: «III Интернационал», 1920. – 31 с.
4. В и с л и н с к и й, М. Внешняя политика Польши на современном этапе / М. Вислинский // Пропагандист. – 1935. – № 10. – С. 42–47.
5. Р а д е к, К. Внешняя политика Советской России / К. Радек. – М.; Пт.: Госиздат, 1923. – 112 с.
6. И о ф ф е, Я. Организация интервенции и блокады советской республики 1918–1920. Очерк / Я. Иоффе. – М.; Л.: Гос. изд-во, отдел воен. лит., 1930. – 167 с.
7. Л о м о в, Л. Польша и ее армия / Л. Ломов. – М.: Гос. воен. изд-во, 1935. – 64 с.
8. Д у д к о ў, Д. Контррэвалюцыйны беларускі нацыянал-дэмакратызм на службе белапольскіх акупантаў / Д. Дудкоў // Бальшавік Беларусі. – 1935. – № 10–11. – С. 113–129.
9. Л о ч м е л ь, И. Ф. Освобождение Белоруссии от белопольских оккупантов (11 июля 1920 г.) / И. Ф. Лочмель. – М.: Госиздат. Белоруссии, отдел полит. лит., 1939. – 53 с.
10. П а п о ў, Ф. Барацьба беларускага народа з белапольскімі акупантамі / Ф. Папоў // Бальшавік Беларусі. – 1940. – № 6. – С. 42–59.
11. С у с л о в, П. В. Политическое обеспечение советско-польской кампании 1920 года / П. В. Суслов. – М.; Л.: Гос. изд-во, отдел воен. лит., 1930. – 174 с.
12. Д р у н и н, В. П. Польша, Россия и СССР. Исторические очерки / В. П. Друнин. – М.; Л.: Госиздат, 1928. – 219 с.
13. М а р х л е в с к и й, Ю. Война и мир между буржуазной Польшей и пролетарской Россией / Ю. Мархлевский. – М.: Госиздат, 1921. – 43 с.
14. Гражданская война 1918–1921. Оперативно-стратегический очерк. – М.; Л.: Гос. изд-во, отдел воен. лит., 1930. – 560 с.
15. Т у х а ч е в с к и й, М. Поход за Вислу / М. Тухачевский // Тухачевский, М. Поход за Вислу. Пилсудский, Ю. Война 1920 г. – М.: Новости, 1992. – С. 3–88.
16. Ш а п о ш н и к о в, Б. На Висле. К истории кампании 1920 года / Б. Шапошников. – М.: Гос. воен. изд-во, 1921. – 208 с.
17. Л о ч м е л ь, И. Ф. Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов / И. Ф. Лочмель. – М.: Воениздат, 1940. – 163 с.


*M. M. MIAZGA*

**POLISH-SOVIET WAR OF THE 1919–1920 YEARS
IN THE SOVIET INTER-WAR HISTORIOGRAPHY**

## Summary

The Soviet historiography of inter-war period on the history of Polish-Soviet war of the years 1919–1920 has been examined. Most important problems of the Polish-Soviet war history shown in the Soviet historiography of inter-war period have been discovered. Main conceptions, conclusions and evaluations formulated on the present problem in Soviet historians of that epoch transactions have been analyzed.